**Уладзімір Ягоўдзік**

## Чарніцы

Народная прыкмета кажа: калі шмат мух – тады шмат і чарніц. А мне здаецца, што чарніц заўжды багата ў нашым лесе. Гэтыя цёмна-сінія, з шызым налётам ягады, бадай, ведае кожны. Яны растуць на нізкіх кусціках з рэдкім дробным лісцем. Дарэчы, зусім няцяжка прыкмеціць: з усіх ягад – чарнічнік найбольш раскошуе ў лесе, на многія кіламетры раскінуліся яго ўладанні. І ў сасновым бары, і ў ельніку, і нават у гаі пад лісцянымі дрэвамі. Быццам хтосьці ці штосьці чарніцам спрыяе. Ні сухмені яны не баяцца, ні змрочнага ценю... А ўся адгадка, мабыць, у старадаўняй легендзе. Калісьці вельмі-вельмі даўно людзі даведаліся, што ў Лесавіка ёсць дзівосныя скарбы, і згаварыліся імі завалодаць. Усе лясы і пушчы перакапалі, шукаючы незлічоныя багацці, шмат векавых дрэў павалілі. Не стала куды прытуліцца беднаму Лесавіку. Пашкадаваў небараку кусцік чарнічніку. Ён не збаяўся, што таксама можа пацярпець, схаваў ляснога ўладара і яго скарбы пад сваімі галінкамі. Людзі не звярнулі ўвагі на маленькія кусцікі побач з магутнымі ялінамі і соснамі. З таго часу ў знак вялікай удзячнасці Лесавік аж па сённяшні дзень апякуецца над чарніцамі, самаручна рассяляе чарнічнік па неабдымных лясных абшарах Лесавіковы ягады цудоўныя на смак і карысныя для здароўя. Але асабліва мне падабаюцца варэнікі з чарніцамі. Цэлую талерку, ды яшчэ з горкаю, з’ясі і зноў папросіш.

**Уладзімір Ягоўдзік**

## Суніцы

З дзяцінства помніцца маміна загадка: сядзіць паненка ў чырвонай сукенцы, хто яе убачыць – той і паклоніцца. Ах, як пахнуць, як хутка растаюць у роце салодкія суніцы! Не ведаю смачнейшага ласунку я на свеце. З ягаднай сям’і суніцы паспяваюць першыя: яны высыпаюць у канцы чэрвеня. Аднак не трэба па іх спяшацца, як па грыбы, не даспаўшы, на раннім досвітку. Бяруць суніцы, калі сплыве туман і прападзе раса.

Інакш яны памнуцца ў кошыку, разлезуцца на кашу. Ну а найлепшыя сунічнікі – каля дарог лясных і сцежак, на колішніх прасеках і светлых палянах. Збіраць жа суніцы – свята, а не работа. Яны самі просяцца ў далонь, але ўмеюць і спрытна хавацца ў траве ці пад сваімі зубчатымі трылісніхкамі. Таму наперад раю: убачыўшы першую ягадку, адразу пакланіся, а тады шукай яе сяброўак. І не тупай, як мядзведзь, не тапчы лішне сунічнік. Суніцы – не толькі смаката, яны таксама лекі. Шмат якія хваробы дзякуючы ім адольвалі ў даўніну нашы дзяды і прадзеды. Лепшае сведчанне таму – народная прымаўка: Суніцы спажываеш – хваробы з сэрца выганяеш. Суніцы сушаць, з іх ціснуць сок і вараць варэнне.

**Уладзімір Ягоўдзік**

## Сон-трава

У старадаўняй легендзе расказваецца... Калісьці даўным-даўно сярод цёмных бароў на высокім пагорку стаяў палац слаўнага ўладара Рыдана. Шмат багацця меў Рыдан, а найвялікшым ягоным скарбам была схаваная за дванаццаццю дзвярамі, замкнутая на дванаццаць замкоў залатая карона, аздобленая камянямі-самацветамі. Калі Рыдан надзяваў гэтую карону на галаву і выходзіў з палаца, дык ноч станавілася днём, а зіма ператваралася ў лета. Суседнія князі зайздросцілі Рыдану і згаварыліся ўкрасці карону. Паклікалі да сябе самых знакамітых ведзьмакоў і загадалі ім прыдумаць, як залезці ў Рыданаў замак. Тры дні і тры ночы думалі ведзьмакі. Нарэшце прыдумалі разрыў-траву, што адчыняла любыя дзверы. Потым загадалі прынесці з лесу сон-траву. Аддалі пучкі абедзвюх траў зладзеям і паслалі іх па залатую карону. Падкраліся зладзеі да Рыданавага палаца, кінулі пад ногі вартаўнікам сон-траву – і вартавыя ўсе як адзін заснулі. Потым дакрануліся разрыў-травою да дзвярэй – і замок адчыніўся. Схапілі дзівосную карону ліхадзеі і ўцяклі. З таго часу ніхто не ведае, дзе знаходзіцца Рыданава карона. І пра вядзьмарскую разрыў-траву таксама больш нічагуткі не чуваць. А вось чароўную сон-траву можна пабачыць сваімі вачыма. Яна зацвітае вясною ў сасновых барах, часцей за усё на сонечных палянах, уздоўж лясных дарог і сцежак. Цёмна-фіялетавыя, надзвычай прыгожыя кветкі сон-травы падобныя на цюльпаны, толькі

драбнейшыя і далікатнейшыя.  Сцяблінкі, што трымаюць званочкі, быццам ахутаны серабрыстымі пушынкамі. Не спяшайцеся рваць сон-траву, каб прынесці яе дахаты. Не так ужо і часта сустракаецца яна ў нашых барах і пушчах. Бывалыя людзі – леснікі і паляўнічыя – сцвярджаюць, што нават ад маленькага букета сон-травы адольвае санлівасць.

**Уладзімір Ягоўдзік**

## Лісічкі

Маленькія жоўтыя лісічкі – сапраўды як дружныя сястрычкі. Паасобку яны не растуць, а нібыта водзяць вясёлы карагод. Убачыў адну – другая просіцца ў рукі. Нахіліўся над ёю – трэцяя кліча да сябе. А там – чацвёртая, пятая, шостая... Толькі паспявай лічыць. Як усё роўна самі просяцца ў кошык. Збіраеш і дзіву даешся: хто іх столькі тут насеяў. Лісічкі – вельмі смачныя грыбы. І, што асабліва важна, яны не чарвівыя. Збірай – не правярай. Смела кідай у кошык: яны ніколі не паломяцца і не пакрышацца, як іншыя грыбы.    Праўда, акрамя сапраўдных, у лесе сустракаюцца і падманныя лісічкі. Як іх адрозніць ад сапраўдных? А вельмі проста. Лісічкі, што мы спажываем, нагадваюць колерам сонечныя зайчыкі, а іх падманныя суседзі – звычайна аранжавыя ці нават чырвоныя. Калі засумняваўся, дружа, спытайся лепш у мамы або таты. Яны падкажуць, памогуць адрозніць. Ніколі не забывайся, што ёсць атрутныя грыбы, якія шкодныя для здароўя і могуць прынесці вялікую бяду, калі іх з'есці.

**Уладзімір Ягоўдзік**

## Задзіра

Іду я па надворку, раптам чую – хтосьці тупаціць. Ды так моцна, аж зямля, здаецца, дрыжыць. Спыніўся я, азірнуўся назад. Вось дык дзіва! Непадалёку певень стаіць. Замер і не варухнецца. Толькі зіркае нядобра жоўтым вокам. Павярнуўся я і смела прастую да ганка. Не паспеў ступіць і пяць крокаў, як за спінаю зноў пачуўся тупат. Нават яшчэ мацнейшы, чым

спачатку. Хочаш не хочаш – спынішся. Гляджу – певень таксама спыніўся. Дзюба адкрыта, грэбень ваяўніча тырчыць. Задзіра, дый годзе. – Ты што, у даганялкі гуляеш? – спытаўся я ў певуна. Паказаў я яму язык, а сам – бокам, бокам – паціху падабраўся бліжэй да ганка. Адным вокам наперад гляджу, другім назад цікую. Даганяты мой мігам скеміў, што я заняў абарону. Следам бяжыць, добра, хоць у бойку пакуль не кідаецца. Да хаты было ўжо блізка. – Акыш! – прытупнуў я на Задзіру. І рашуча павярнуўся да яго спінаю. А вось што далей было, лепш не ўспамінаць. Толькі ступіў на ганак – атрымаў удар у плечы. Я хутчэй да дзвярэй. А Задзіра – фы-р-р! – мне на спіну. І дзяўбе, паганец, дзяўбе ў галаву, як долатам якім. Тут ужо не да жарцікаў. Паспрабаваў я стрэсьці з сябе пеўня. Дудкі! Шапку згубіў, а ён як сядзеў на мне, так і сядзіць. Адзін ратунак – схавацца ў хату. Я за ручку. І так, сяк яе тузаю – на ўсю вуліцу звініць. А дзверы не адчыняюцца. Танцую па ганку з пеўнем на галаве – ніяк не магу ад злыдня збавіцца. Не ведаю, як усё абярнулася б, каб не баба Анюта. Вылецела з хаты, пляснула рукамі: – Авой! І зноў ты сядзіш у госця на галаве! Добра, што ў сенях каля парога венік стаяў. Схапіла гаспадыня дзяркач і давай біць пеўня. З таго дня я ўжо не паказваўся на надворак без веніка ў руцэ.

**Уладзімір Ягоўдзік**

## Бусел

А ці ведаеш ты, мой дружа, адкуль з'явіліся на нашай зямлі буслы і чаму яны любяць жыць па вёсках, сярод людзей? Не чуў? Тады слухай. Калісьці вандраваў на белым свеце добры чараўнік. І заблукаў ён на Беларусь. Бачыць – прыгожая тут зямля. Адно кепска: развялося шмат розных паўзучых гадаў. Жыцця ад іх няма ні людзям, ні жывёліне. Узяў чараўнік вялізную торбу і сабраў туды ўсіх жаб і гадзюк. Вядома, стаміўся ад такой нялёгкай работы. Не хапіла сілы самому падняць і занесці тую торбу, каб укінуць у бяздонную яму. Таму і гукнуў на падмогу хлопца, які сена касіў на лузе. Узваліў яму чараўнік торбу на спіну ды загадаў не развязваць па дарозе. А хлопец аказаўся вельмі цікаўны. Захацелася яму зірнуць, што ў торбе варушыцца ды сыкае. Схаваўся ён за куст і развязаў

торбу. Як развязаў – дык самлеў ад страху. Гады тым часам вылезлі і зноўку распаўзліся па ўсёй зямлі.    Добры чараўнік не схацеў другі раз іх збіраць. Даў ён парожнюю торбу неслуху-касцу на плячо – выправіў яго збіраць выпушчаных гадаў. Толькі хлопец злавіў першую жабу – як ператварыўся ў бусла.    З таго часу і дыбае бусел, нібы касец, па лугах-балотах. Босы, а чырвонымі нагамі, у белай кашулі і з чорнаю торбаю за спіной. Потым чараўнік злітасціваўся над буслом, паслаў яму на падмогу жонку-бусліху і дзетак-буслянят. А жыць дазволіў у вёсцы, сярод людзей, каб не забыліся, што вядуць свой пачатак ад чалавечага роду. Людзі таксама помняць пра гэта, таму ніколі не крыўдзяць буслоў, шануюць іх, як родных братоў.

**Уладзімір Ягоўдзік**

**Атаман-барабан**

Атаман – вялікі, з чорнаю калматаю поўсцю сабака. Адно вуха тырчком, другое вісіць. Жыве ён за хлявом, у пустой жалезнай бочцы. З Атаманам я хутка пасябраваў.    Атаман не брахаў абы брахаць. Затое калі падаваў голас, дык уся вёска чула: бухаў, быццам барабан. Жыццё на ланцугу – не салодкае, таму праз некалькі дзён Атаман стаў маім верным спадарожнікам, куды б я ні ішоў. Часцей за ўсё мы хадзілі на далёкае лясное возера. Зімовы дзянёк – што камаровы насок. Туды-сюды павярнуўся – ужо ноч навалілася. Цёмная, глухая, маўклівая. А да вёскі ажно шэсць кіламетраў яшчэ тарабаніць. Ды ўсё па лесе... Ці мала цяпер галоднага звера блукае? Але гэта баязліўцам кожны корч мядзведзем здаецца. А мы з Атаманам і самому мядзведзю хвост накруцім.  Я ні кропелькі не сумняваўся, што мой Атаман – над усімі сабакамі атаман, нікога і нічога не баіцца.    Аднойчы я вярнуўся з лесу. Баба Анюта якраз карміла курэй і гусей, але кудысьці адлучылася. Атаман заляцеў на надворак і, распалохаўшы курынае войска, прыпаў да карыта з цестам. Потым крутнуўся да другога карыта, каля якога хадзілі гусі. Гусі – не куры, на паўвёскі паднялі крык. Атаман, не зважаючы на гусей, налягаў на цеста. І раптам ён перастаў есці. Проста на сабаку, выцягнуўшы доўгую, падобную на гадзюку, шыю, наступаў гусак. Здаецца, вось-вось наляціць,

затопча, змяшае з зямлёю!   У Атамана ад здзіўлення абвіслае вуха паднялося: «Што за дзіва? Адкуль такі герой?»  А гусак усё наступае і так шыпіць, аж мне зрабілася страшна.  Тым часам сабака падціснуў хвост і – бокам, бокам – далей ад карыта.  – Га-га-га! Га-га-га! – пераможна зарагаталі гусі. Я ж стаяў як укопаны і гатоў быў ад сораму скрозь зямлю праваліцца. Мо з тыдзень не мог дараваць Атаману ганьбу. Пасля зноў пачаў браць з сабою ў вандроўкі. Удваіх весялей. Няхай сабе і з Барабанам – называць сабаку Атаманам у мяне не паварочваўся язык.